Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Майская базавая школа Жлобінскага раёна”

Факультатыўны занятак

# *“Правапіс літар і,ы,й”*

Для распрацоўкі факультатыўнага занятку выбрана тэма “Правапіс літар і, ы, й”, на вывучэнне якой праграмай адведзена адна гадзіна. Гэта адна з апошніх тэм , якая вывучаецца ў раздзеле “Правапіс галосных”.

**2015**

**План-канспект**
**факультатыўнага занятку ў 6 класе па праграме**
**“Вывучаем беларускі правапіс”**
**па модульнай тэхналогіі па тэме “Правапіс і, ы, й”**

Мэта: удакладніць і сістэматызаваць веды вучняў аб правапісе і, ы, й; удасканальваць уменне правільна пісаць словы з і, ы, й пасля прыставак; развіваць маўленне вучняў, папаўняць іх слоўнікавы запас;
садзейнічаць выхаванню пашаны да духоўных і матэрыяльных здабыткаў беларускага народа.
Абсталяванне: Вывучаем беларускі правапіс. 5-9 кл.: вучэбна-метадычны комплекс/ Г.М. Валочка, В.У. Зелянко. – Мінск: Нац. інстытут адукацыі, 2010. – 176 с. – ( Беларуская мова. Факультатыўныя заняткі);
надрукаваныя тэксты для працы вучняў; дадатак №1, дадатак №2; аўдыёзапіс музыкі П.Марыа для НЭ – 4.

Правапіс і, ы, й
Вучэбны матэрыял модуля
Назвы навучальных элементаў (НЭ) модуля
НЭ – 0 – інтэграцыйная дыдактычная мэта (ІДМ)

| *Нумар элемента* | *Вучэбны матэрыял з указаннем заданняў* | *Кіраўніцтва працай і рэкамендацыі* |
|---|---|---|
| НЭ -0 | У працэсе работы над модулем неабходна засвоіць правапіс і, ы, й; удасканаліць уменне правільна пісаць словы з і, ы, й пасля прыставак | |
| НЭ - 1 | ***Паўтарэнне папярэдняй тэмы “Правапіс прыстаўных галосных літар і, а”***<br>Мэта: праверыць, як засвоены матэрыял па тэме”Правапіс прыстаўных галосных і, а”<br>1. Якія прыстаўныя галосныя літары вы ведаеце? | |

| | | |
|---|---|---|
| | 2. Калі пішацца прыстаўная галосная літара і? Прывядзіце прыклады<br>3. Калі не пішацца прыстаўная галосная літара і? Прывядзіце прыклады<br>4. У якіх словах пішацца прыстаўная галосная літара а? Прывядзіце прыклады<br>5. Запішыце, устаўляючы, дзе трэба, прыстаўныя галосныя. Растлумачце іх адсутнасць або наяўнасць<br>Па ..льготным білеце, на ..льдзіне, пад ..льдом, новы ..льнокамбінат, серп ..ржавы, словы ..лжывыя, пакрыцца ..ржой, да ведаў ..мкнуцца, над ..лбом, абутак ..рвецца, па ..ржэўніку, праезд ..льготны, машына ..рванула, леташняе ..ржышча, ластаўка .. мклівая, уперад ..рвануўся, рэакцыя ..мгненная. | Карыстайцеся тэарэтычным матэрыялам (Дадатак 1 – Прыстаўныя гукі)<br><br>Абмяняйцеся сшыткамі і праверце адзін аднаго |
| НЭ - 2 | ***Правапіс і, ы, й***<br>Мэта: засвоіць правапіс і, ы, й; навучыцца знаходзіць словы ў тэкстах, якія адпавядаюць дадзенаму правілу, тлумачыць правапіс і, ы, й<br>*Заданне 1.* Прачытайце тэарэтычны матэрыял (дадатак 2)<br>*Заданне 2.* Пасля знаёмства з тэарэтычным матэрыялам паспрабуйце завяршыць выказванні:<br>1. Гук [і] пасля прыставак на галосны чаргуецца з… . Напрыклад…<br>2. Пачатковы каранёвы гук [і] пасля прыставак на галосны перадаецца нязменна, калі… . Напрыклад … | |

| | | |
|---|---|---|
| | 3. Пачатковае *і* захоўваецца пасля такіх прыставак, як … . Напрыклад…<br>4. У складаных словах пачатковае *і*… . Напрыклад…<br>5. Пры спалучэнні прыставак *аб-, ад-,пад-, над-, раз-, з-(с-), уз-, перад-, дэз-, суб-* са словамі, што пачынаюцца з і, вымаўляецца і пішацца… . Напрыклад…<br><br>*Заданне 3.* Раскажыце свайму суседу, што новага вы даведаліся па гэтай тэме, якія змены адбыліся ў правапісе<br>*Заданне 4.* Праца з тэкстам.<br>Пасля абеду Лабановіч сабраўся прайсціся. Ён выйшаў на двор. На вуліцы было столькі гразі, што перайсці яе ў настаўніка не хапіла адвагі. Ён павярнуў на поле, дзе стаялі два ветракі, і зараз жа выйшаў на вузкую сцежку, якая вяла на чыгунку. Узышоўшы на чыгунку, настаўнік прыпыніўся, разважаючы, у які канец пайсці.<br>*(Паводле Я. Коласа)*<br>*Заданне 5.*<br>1.Мы разгаварыліся і разам ад..шлі да акна ў дальнім кутку залы *(У.Караткевіч).*2. Пад..шоўшы да адной з такіх ямін, хлопцы заўважылі, як у вадзе шмыгнула нешта цёмнае *(Я.Маўр).* 3. На аблаву вы..шлі перад самым усходам сонца *(М.Зарэмба).* 4. Са смехам, з песнямі ды жартамі пачалі ўсе раз..ходзіцца па хатах *(А. Карлюкевіч).* 5. Раніцай, як толькі сонейка ўз..шло, паднялося, па..шлі мы ўсе накрыўкі | Праца ў парах (групах)<br><br>Выпішыце словы, напісанне якіх адпавядае правілу “Правапіс літар і, ы, й”. Назавіце арфаграмы ў выпісаных словах, растлумачце правапіс.<br><br>Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары:<br>1 варыянт выпісвае сказы, дзе прапушчана літара *ы* пасля прыставак, 2 |

| | | |
|---|---|---|
| | скідаць ды гародніну вадой з палівачак паліваць *(У. Дубоўка).* 6. Цікаўнасць мая да..шла да мяжы немагчымага. (*У. Караткевіч).* 7. Мы і не заўважылі, як над..шоў вечар *(В. Вольскі).*<br><br>ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА. Зернейка ўпала ў зямлю, і было яно маленькім-маленькім, але надышоў час, і яно пачало расці (лічым ад аднаго да пяці), выпусціла зернейка шмат вусікаў ( махі рукамі на лік дзесяць), з’явіліся злыя вятры і сталі калыхаць колас (наклоны тулава ўправа-ўлева на лік дзесяць), аж прысядаў колас, калі грымелі навальніцы (прысесці дзесяць разоў), але якое дзіва: (закрыць вочы далонямі і, адкрыўшы іх, усміхнуцца) ён вырас і ператварыўся ў духмяны хлеб, якім мы частуемся. І скажам яму: ВЯЛІКІ ДЗЯКУЙ.<br><br>*Заданне 6.* “Назвы роднага краю”<br>Займішча<br>У старабеларускай мове *займішча* (ад дзеяслова *займаць*) – спецыяльна адведзенае месца ў лесе пад пасевы, сенажаць і інш. Лясныя дзялянкі звычайна абводзіліся спецыяльнымі знакамі-засечкамі. Пазначаную (занятую) | варыянт – літара *й* пасля прыставак. Абмяняйцеся сшыткамі і праверце адзін аднаго.<br>Падкрэсліце ў словах з тэксту тыя месцы, дзе можна дапусціць памылкі.<br>Растлумачце іх правапіс.<br>На дошцы запісана слова *надышоў.*<br>Растлумачце правапіс *ы* пасля прыстаўкі. Замест прыстаўкі *над-* падбярыце прыстаўкі на галосны.<br>Растлумачце, як зменіцца правапіс слова *надышоў.*<br><br>Прачытайце тэкст. Растлумачце правапіс *й* у слове *займішча* |

<table>
<tr>
<td></td>
<td>
такім спосабам дзялянку ніхто іншы не меў права гвалтоўна захапіць<br>
( Паводле В. Лемцюговай)<br>
Заданне 7. Арфаграфія і фразеалогія
<table>
<tr><td>а) вы..сці сухім з вады</td><td>1) зусім не закрануць, мінуць каго-небудзь, што-небудзь</td></tr>
<tr><td>б) ад..сці ў нябыт</td><td>2) дзейнічаючы ашуканствам, застацца непакараным</td></tr>
<tr><td>в) пры..шло ў рукі</td><td>3) каму-небудзь становіцца цяжка дыхаць (ад хвалявання, перажывання і пад.)</td></tr>
<tr><td>г) аб..сці бокам</td><td>4) перастаць існаваць, знікнуць назаўсёды</td></tr>
<tr><td>д) ад..граваць ролю</td><td>5) перашкодзіць каму-небудзь, апярэдзіўшы ў чым-небудзь і перахапіўшы тое, на што разлічваў іншы</td></tr>
<tr><td>е) за..мае дух</td><td>6) вельмі лёгка дасталося</td></tr>
<tr><td>ж) раз..грываць камедыю</td><td>7) мець значэнне, аказаць уздзеянне на каго-небудзь, што-небудзь</td></tr>
</table>
</td>
<td>Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі. Растлумачце правапіс літар і, ы, й. Запішыце фразеалагізм, які вам найбольш спадабаўся. Растлумачце свой выбар. Складзіце з ім сказ, запішыце.</td>
</tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| | з) пера..сці дарогу / 8) прыкідвацца перад кім-небудзь, крывадушнічаць | |
| НЭ - 3 | **Выніковы кантроль**<br>Мэта: праверка і карэкцыя атрыманых ведаў і ўменняў па вывучаемай тэме модуля<br>*Заданне 1.* Тэст для самаправеркі<br>А1. Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *й*:<br>1) пера..начыць<br>2) за..нелы<br>3) пра..нфармаваць<br>4) за..сці<br>5) узы..шоў<br><br>А2. Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *і*:<br>1) спад..лба<br>2) паліт..нфармацыя<br>3) дэз..нфармацыя<br>4) пад..граць<br>5) контр..гра<br><br>А3. Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) надыйшоў<br>2) дэзынфіцыраваць<br>3) зайскрыцца<br>4) безыніцыятыўны<br>5) медінструменты<br><br>А4. Адзначце словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:<br>1) заіканне<br>2) абыграць<br>3) безіменны | Самастойная праца. *Гучыць павольная музыка* |

| | | |
|---|---|---|
| | 4) бортінжынер<br>5) неімаверны<br><br>В1. Запішыце дзеяслоў, утвораны з дапамогай прыстаўкі *пра*- ад слова *існаваць* | |
| НЭ -4 | **Рэфлексія “Анкета”**<br>1) На ўроку я працаваў… актыўна/пасіўна<br>2) Сваёй працай на ўроку … задаволены/незадаволены<br>3) Урок для мяне паказаўся … кароткім/доўгім<br>4) За ўрок я … стаміўся /не стаміўся<br><br>або<br>прыём **“Сонейка”** (на выбар настаўніка)<br><br>Мой настрой падобны на:<br>● сонейка,<br>● сонейка з хмаркай,<br>● хмарку,<br>● хмарку з дажджом,<br>● хмарку з навальніцай | |